# ІСТОРІЯ НАСИЛЬСТВА

*Наталля Сліж*. Згвалтаванні ў Вялікім Княстве Літоўскім у XVI–XVII ст.: заканадаўства і судовая практыка

*Наталя Старченко*. Справи про згвалтування в шляхетському середовищі Волині (остання третина XVI – перша половина XVII ст.)

*Наталія Білоус*. Насильство над жінками: сюжети з міщанського і селянського повсякдення Волині XVI – початку XVIII ст.

*Марія Гарасимчук*. Справи про зґвалтування й позбавлення цноти у судах Самбірської економії в XVII ст.

*Олексій Вінниченко*. Зґвалтування, вбивство і пограбування, а також перелюб. Історія кримінального злочину, здійсненого під Львовом в 1645 р.



ISSN1995-0322. СОЦІУМ. Альманах соціальної історії. Випуск 11-12. – С. 91–103

УДК 396.6:343.54:94(476)”15/16”

*Наталля Сліж*

# ЗГВАЛТАВАННІ Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ У XVI–XVII стст.: ЗАКАНАДАЎСТВА І СУДОВАЯ ПРАКТЫКА

Тэма згвалтаванняў у Вялікім Княстве Літоўскім у XVI–XVII стст. практычна засталася паза ўвагай даследчыкаў[1]. Яна тэма даволі спецыфічная для даследавання і як правіла вывучаецца ў кантэксце гендэрных адносін, гісторыі сексу, крымінальных злачынстваў[2]. Стаўленне грамадства да сексуальных стасункаў з’яўляецца важным паказальнікам гендэрнай дыскрымінацыі, а таксама дадатковай крыніцай па гендэрных стэрэатыпах, ролях і статусе мужчыны і жанчыны ў грамадстве. У гэтым кантэксце сексуальны гвалт супраць жанчыны паказвае ці ўспрымаюцца нармальнымі альбо паталагічнымі такія паводзіны мужчыны ў дадзеным грамадстве. Адначасова гэта прадстаўляе ступень агрэсіўнасці адносна жанчын, а таксама ваяўнічасць гендэрных дачыненняў.

Феадальнае грамадства ад самага пачатку з’яўляецца патрыярхальным і іерархічным, дзе кожнаму/кожнай вызначана роля ў залежнасці з полам і ўзростам. Адпаведна жанчына павінна падпарадкоўвацца мужчыне ў сям’і і, канечне, у сексе. Жаданні мужчыны з’яўляюцца першаснымі. Сексуальныя дачыненні ў шлюбе станавіліся абавязкам. Напрыклад, паводле праваслаўнага кананічнага права за пазбяганне сексуальных стасункаў з мужам жанчыне пагражала анафема. Жаданне мужа ці жонкі ўстрымацца ад ложка узгаднялася паміж сужэнцамі. А калі ўстрыманне прыводзіла да блуду мужа ці жонкі, то грэх клаўся на абаіх[3].

Згвалтаванне ў заканадаўстве многіх краін лічылася цяжкім злачынствам, за якое прадугледжвалася смяротнае пакаранне[4]. Яно трактавалася як гвалт волі

[1] Згвалтаванне разглядалася намі ў кантэксце рэгулявання шлюбных дачыненняў у заканадаўстве ВКЛ, гл: *Сліж Н*. Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты ў звычаёвым праве і заканадаўчых актах ВКЛ // Соціум. – К., 2014. – Вип. 10. – С. 265-266, 276-277.

[2] *Krawiec A*. Seksualność w średniowiecznej Polsce. – Poznań, 2000; *Lynn Martin A*. Alcohol, Sex, and Gender in Late Medieval and Early Modern Europe. – New York, 2001; *Вінниченко О*. «Ґвалт поневольний»: дві скарґі про сексуальне насильство над селянками-підданками 1637 і 1648 рр. // Вісник Львівського ун-ту. Серія історична. – 2013. – Вип. 48. – С. 435-451 і інш.

[3] Молитовник или Требникъ из греческого языка на словенски переведенный и иследованый. – Стратынь, 1606. – С. 372 адв., 374 адв.–375.

[4] *Koranyi K*. O niektórych postanowieniach karnych Statutu Litewskiego z r. 1529. Studium prawnoporównawcze // Księga pamiątkowa ku uczczeniu czterechsetnej rocznicy wydania I Statutu Litewskiego. –

© Наталля Сліж, 2015

жанчыны, які прыводзіў да парушэння спакою яе сям'і і грамадства, да знявагі звычаяў[5], замаху на сямейную маёмасць, напрыклад, як у мазавецкім праве[6]. Згвалтаванне як злачынства згадвалася ў сярэднявечных крыніцах польскага права. Неабходнай умовай сведчання пра гвалт быў крык аб дапамозе[7]. Падобны артыкул быў у Вісліцкім Статуце, які быў вядомы ў ВКЛ[8]. Ён утрымліваў інфармацыю пра абставіны гвалту (крык, знакі гвалту). Аднак у пералічаных крыніцах права не прадугледжвалася магчымасць шлюбу з гвалтаўнікам як у Вестгоцкай Праўдзе (654 г.), па якой дазвалялася ўзяць шлюб, калі бацькі не былі супраць[9]. Ідэю шлюбу з гвалтаўнікам прапагандаваў з даўніх часоў касцёл. Рашэнне належала да ахвяры[10].

З прыходам хрысціянства на нашы землі сексуальныя дачыненні перайшлі ў сферу кантролю царквы. Статут Яраслава лічыў злачынствам згвалтаванне, умыканне, групавое згвалтаванне. Старажытны звычай умыкання нявесты прыраўноўваўся да згвалтавання[11]. Пра яго існаванне ў старажытных плямёнах, якія насялялі тэрыторыю Беларусі, адзначаецца ў летапісе. Звычай быў уласцівы і іншым народам. Умыканне адбывалася каля вады ці падчас гульняў, са згоды ці без згоды дзяўчыны[12]. У Беларусі захаваўся нават у XIX ст.[13] Такое стаўленне царквы да згвалтавання прыйшло з візантыйскага права, артыкулы якога ўваходзілі ў склад кормчых. Па візантыйскім праве за гвалтоўныя дзеянні са зброяй асуджалі на смерць, а без зброі – на адсячэнне рук. За згвалтаванне і спакушэнне дзяўчыны ці чужой нявесты пагражала адсячэнне носа і 1/3 маёмасці злачынцы пераходзіла дзяўчыне. Калі дзяўчына была непаўналетняя (да 14 год), то ёй пераходзіла палова маёмасці[14]. Кананічнае права прызначала пакаранні за згвал-

---

Wilno, 1935. – S. 149-154; *Krawiec A*. Seksualność w średniowiecznej Polsce. – Poznań, 2000. – S. 151-152.

[5] *Czacki T*. O litewskich i polskich prawach, o ich duchy, źródłach, związku, i o rzeczach zawartych w I Statucie dla Litwy, 1529 r. wydanym. – T. 2. Kraków, 1861. – S. 138-139.

[6] *Krawiec A*. Seksualność. – S. 178-179.

[7] Артыкулы аб згвалтаванні ўтрымлівалі Эльбланская кніга, Мазавецкае права, Статут Казіміра Вялікага. *Koranyi K*. O niektórych postanowieniach karnych Statutu. – S. 149-154; *Krawiec A*. Seksualność. – S. 168-203.

[8] Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею (далей – АЗР). – Т. 1, 1361–1598. – СПб., 1848. – С. 11, 18; *Максимейко Н*. Источники уголовных законов Литовского Статута. – К., 1894. – С. 116–117.

[9] *Brudage J.A*. Law, Sex, and Christian Society in Medieval Europe. – Chicago; London, 1987. – P. 133.

[10] *Koranyi K*. O niektórych postanowieniach karnych Statutu. – S. 151–152.

[11] *Макарий*. История русской церкви. Кн. 2. История русской церкви в период совершенной зависимости ее от константинопольского патриарха (988–1240). Т. 2. Состояние русской церкви от митрополита Иллариона до избрания митрополита Климента Смолятича (1051–1147). – Москва, 1994. – С. 257; Российское законодательство X–XX вв. – Т. 1. – М., 1984. – С. 175; *Гальковский Н.М*. Борьба христианства с остатками язычества в Древней Руси. – Т. 1. – Харьков, 1916. – С. 106.

[12] Полное собрание русских летописей (далей – ПСРЛ). – Т. 1. – СПб., 1846. – С. 6; *Загоровский А*. О разводе по русскому праву. – Харьков, 1884. – С. 3-12.

[13] *Никольский Н.М*. Происхождение и история белорусской свадебной обрядности. – Минск, 1956. – С. 52-55.

[14] «Книги законные» содержащия в себе, в древне-русском переводе, византийские законы земледельческие, уголовные, брачные и судебные / Издал А. Павлов. – СПб., 1885. – С. 67, 74.

таванне замужняй жанчыны, дзеўкі, манашкі. Муж таксама лічыўся гвалтаўніком, калі здзяйсняў гвалт адносна жонкі[15].

З увядзеннем на тэрыторыі ВКЛ магдэбургскага права (першы горад Вільня ў 1387 г.) сталі дзейнічаць Саксонскае Люстра і Вейхбільд. Гэтыя заканадаўчыя акты прадугледжвалі за згвалтаванне смяротны прысуд. Пра выпадак неабходна было паведаміць адразу, прадставіць доказы злачынства. Дом, у якім была згвалтавана жанчына, знішчаўся. Нават, калі пасля здарэння адбыўся шлюб, дзеці лічыліся незаконнанароджанымі, а жанчына выганялася з горада. Пры гэтым закон дазваляў больш лагоднае стаўленне да мужчыны, які сам прыйшоў у суд для доказу сваёй невінаватасці (Саксонскае Люстра, кн. 1, арт. 37; кн. 2, арт. 13, 64; кн. 3, арт. 1; Вейхбільд, арт. XXXVIII). У перакладным выданні Барталамея Гроіцкага згвадваецца пра смяротнае пакаранне за згвалтаванне[16].

Статут ВКЛ 1529 г. увёў артыкул аб згвалтаванні. Гэтыя справы былі ў кампетэнцыі ваяводаў і старостаў[17]. Разглядаліся толькі тыя выпадкі, дзе жанчына аказвала супраціў. Знакам супраціву падчас гвалту быў крык. Калі на шум не прыбеглі людзі, то пацярпелая павінна была адразу, пасля таго як яе адпусцілі, распавесці пра злачынства і паказаць знакі гвалту. Па заканадаўстве злачынцу пагражала смяротнае пакаранне. Аднак згода дзяўчыны на шлюб выратоўвала яго ад смерці. (Статут 1529 г. Р. 7. Арт. 6)[18]. Такім чынам у злачынцы быў выбар паміж шлюбам і смерцю, калі жанчына не была замужам. Статуты 1566 і 1588 гг. захавалі без зменаў норму Статута 1529 г. (Статут 1566 г. Р. 11. Арт. 8; Статут 1588 г. Р. 11. Арт. 12). А злачынства, па-ранейшаму, разглядалася ваяводамі і старостамі (Статут 1588 г. Р. 4. Арт. 30).

У старабеларускай мове ў юрыдычнай тэрміналогіі зафіксаваны два вызначэнні для згвалтавання: «усилство» і «кгвалтованье». Першы тэрмін сустракаецца ў перакладзе Вісліцкага Статута. Ён выкарыстоўваўся для характарыстыкі злачынстваў, пры здзяйсненні якіх ужывалася сіла. У артыкулах пра абрабаванні ёсць блізкія тэрміны «сильник» (рабаўнік), «сильно возмет» (забярэ гвалтам). Здзяйсненне згвалтавання ў перакладзе было апісана як «коли хто усилует девку, а либо жонку, кгвалтомъ»[19], а ў Статуце – «естли бы хто невестку

[15] Молитовник или Требникъ из греческого языка на словенски переведенный и иследованый. – Стратынь, 1606. – С. 365-365 адв.; Номоканон сий естъ законоправилникъ. – Львов, 1646. – С. 26; Еухологіон албо молитвословъ или требникъ. – Лвовъ, 1682. – С. 22 адв.–23.

[16] *Jasker N.* Juris provincialis quod Speculum Saxonum vulgo nuncupatus libri tres opera vigilanti in correctiorem redacti materiam, adjuncti simul glossis aliisque additionibus noviter reccollectis pro interpraelatione textus magis neccessariis Annotatainsuper in marginibus habentur loca legum Jurisque municipalis Magdeburg. – Cracoviae, 1535. – Fol. XXXVv-XXXVIv; *Groicki B.* Porządek sądów i spraw miejskich prawa majdeburskiego w Korornie Polskiej / Oprac. K. Koranyiego. – Warszawa, 1953. – S. 199; *Krawiec A.* Seksualność. – S. 191-197; *Вінниченко О.* «Ґвалт поневольний». – С. 477.

[17] Русская историческая библиотека. Т. 20. Литовская метрика. Т. 1. – Петербург, 1903. – С. 665; *Лаппо И.И.* Великое княжество Литовское за время от заключения Люблинской унии до смерти Стефана Батория (1569–1586). – Т. 1. – Юрьев, 1911. – С. 291.

[18] *Малиновский И.А.* Учение о преступлении по Литовскому Статуту. – К., 1894. – С. 55-56; *Валиконите И.М.* I Литовский Статут – один из важнейших источников истории положения женщин в Великом Княжестве Литовском // Первый Литовский Статут 1529 г. – Вильнюс, 1982. – С. 45.

[19] АЗР. – Т. 1. – 1361–1598. – СПб., 1846. – С. 11, 14-15.

або девку зкгвалтил»[20]. Выкарыстанне сілы або гвалту падаецца як раўназначныя тэрміны. Яны паказваюць, што для дасягнення мэтаў злачынца ўжыў сілу, а само дзеянне мела гвалтоўны характар і было здзейснена супраць волі іншай асобы. Тэрмін «кгвалтованье» ужываўся таксама ў судовай практыцы.

У судовых кнігах скаргі аб згвалтаванні сустракаюцца рэдка: па-першае, гэта трэба было даказаць, а па-другое, абвесціць аб гэтым. Жанчына ад самага пачатку станавілася ахвярай. Яна цярпела гвалт, вынікам якога маглі быць розныя наступствы: збіццё, хваробы, цяжарнасць, псіхалагічная траўма. Апавяданне перад судом прымушала перажыць здарэнне яшчэ раз. Акрамя таго, не было аптымізму адносна далейшага жыцця пасля згвалтавання.

Судовы працэс па справах згвалтавання складаўся з наступных элементаў: скарга, агляд пацярпелай, працэс, на якім разглядаліся доказы злачынства і выносіўся прысуд. Судовыя выпадкі не заўсёды даюць магчымасць прасачыць усе моманты працэсу. Часта кнігі ўтрымліваюць толькі судовыя скаргі. Акрамя таго, магістрацкія, гродскія кнігі захаваліся ў вельмі абмежаванай колькасці. Гэта не дае выявіць тэндэнцыі ў злачынствах. Выяўленыя факты паказваюць толькі варыятыўнасць правапарушэнняў.

Праблема доказу гвалту прадстаўлена ў наступнай справе. Парабак Цікан абвінаваціў у згвалтаванні сваёй дачкі Нядзелькі свіслацкага мешчаніна Юрыя Вінніка. У сваю чаргу ён абвінаваціў яе ў крадзяжу і ўцёках. Згвалтаванне адбылося ў бровары, а не змагла паклікаць на дапамогу, бо Віннік закрыў рот шапкай. Дзяўчына распавяла пра выпадак жонцы войта і іншым жанчынам. Але па прычыне адсутнасці трох сведак і іншых доказаў абвінавачаны быў прызнаны невінаватым (1537). Пры вынясенні прысуду суддзі кіраваліся нормамі Статута 1529 г.[21] Па сутнасці ў гэтым выпадку словы Нядзелькі былі супраць словаў Вінніка. Не будучы ўпэўненымі ў здарэнні злачынства суддзі апраўдалі Вінніка.

У судовых дакументах сустракаюцца выпадкі нападаў групы злачынцаў з мэтай гвалту і рабавання. Падданы Рамейка Лаўрыновіч паскардзіўся на служэбніка крынскага старосты Грыгорыя Валовіча – Бенядзікта Сцяцковіча, Богуша Язохву, крынскага мешчаніна Шчэбета і іх памочнікаў, што ноччу перанялі яго, сына Бэлю і нявесту, якая была дзеўкаю. З імі было 9 сватоў і сваха. Яны перабілі вясельны «поезд», паранілі і згвалтавалі дзеўку і сваху, забралі ў іх рэчы. Рашэнне па справе адклалі да прыезду Івана Валовіча (1540)[22].

Вайскоўцы былі патэнцыйнай небяспекай для жанчын. Яны доўгі час не мелі сексу, былі агрэсіўныя, усё што ім было неабходна атрымлівалі праз зброю. Гаспадарскі баярын Мікалай Андрэевіч падаў скаргу на вайскоўца Яна Целка, які звёз з дому яго дачку Ганну і згвалтаваў (1565). Разам з віжам Мікалаем

[20] Первый Литовский Статут (1529 г.) / С. Лазутка, И. Валиконите, Э. Гудавичус. – Вильнюс, 2004. – С. 197.

[21] Судебная книга витебского воеводы, господарского маршалка, волковысского и оболенского державцы М.В. Клочко. 1533–1540 (Литовская метрика. Книга № 228. Книга судных дел № 9 / [публ. подг. В.А. Воронин, А.И. Груша, И.П. Старостина, А.Л. Хорошкевич; отв. ред. А.Л. Хорошкевич, Г.Я. Голенченко]). – Москва, 2008. – С. 96-97.

[22] Акты, издаваемые Виленскою комиссиею для разбора древних актов. Т. 17. Акты Гродненского земского суда. – Вильна, 1890. – С. 228-229.

Венцлававічам знайшлі дзяўчыну. Гарадзенскія мяшчанкі яе агледзелі і засведчылі сляды згвалтавання. Справа ўскладнялася тым, што Ганна была непаўналетняя. Выпадак адбываўся падчас Інфлянскай вайны, калі дзеянні вайскоўцаў часта мелі незаконны характар[23]. Падобная скарга патрапіла ў Луцкі гродскі суд на таварышаў роты Януша Мікалаевіча Збаражскага – Данілу Касцюшковіча, Кіселінскага і іншых (1567). Прыехаўшы ў Торчын, яны нарабілі шмат шкоды мясцоваму насельніцтву, у карчме «*полнячи грех содомъскии*»[24], звезлі дзвюх прыстойных жанчын з мястэчка[25].

Істотную розніцу ў пакаранні ў ваеннай сітуацыі за згвалтаванне ў ВКЛ і Маскоўскім княства паказвае ў сваім дзённіку Самуэль Маскевіч. Дзеянні адбываліся падчас выправу на Маскоўскае княства. Слуга аднаго з вайскоўцаў ВКЛ ўзяў гвалтам дачку баярына, калі яе сям'я ехала з лазні да дому. Дзяўчына вярнулася да бацькоў толькі праз два тыдні. Судзілі слугу на агульным сходзе вайскоўцаў. Па праве ВКЛ настойвалі на смяротнае пакаранне. Бабоўскі прапанаваў судзіць па маскоўскіх законах. У выніку прысудзілі да лупцавання бізунамі, што задаволіла абодва бакі (1610)[26].

Сустракаюцца скаргі на шляхту. Слонімскі баярын Гаўрыла Аверкавіч абвінаваціў баярына Васіла Ярмаловіча ў згвалтаванні жонкі і выклікаў вознага для яе агляду (1570)[27]. 18 ліпеня 1586 г. жонка каралеўскага ротмістра Марціна Карызны, Ганна Каспараўна Падгайская, падала скаргу на жамойцкага земяніна Каспара Марцінавіча Юшкевіча за згвалтаванне. Жанчына была ў гасцях у шляхты Упіцкага павета – Мікалая Вековіча і яго жонкі Крысціны Баброўніцкаўны ў маёнтку Пакрое. Яна засталася ў іх начаваць. Юшкевіч, які таксама гасцяваў, ноччу ўварваўся ў яе пакой, выбіў дзверы, збіў жанчыну і згвалтаваў. На месца злачынства быў выкліканы возны, які пры аглядзе засведчыў раны і крывавую разарваную кашулю на жанчыне[28]. Пётр Мікалаевіч Дарагастайскі падаў скаргу ад імя сваёй баярыні Марыны Сякіраўны. 21 студзеня 1590 г. яе дачка Ганна Шэцілаўна гасціла ў доме ў Смалявічах ў сваячкі. Пад вечар смалявіцкі ўраднік віленскага ваяводы Мікалая Крыштафа Радзівіла Ян Няміра разам з памочнікамі напаў на дом, згвалтаваў дзяўчыну, звёз яе на двор ваяводы і там трымаў некалькі тыдняў. Падаць скаргу змаглі толькі 10 лютага[29]. Якія

---

[23] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – КМФ-18, спр. 261, арк. 155-156.

[24] Да «садомскага граху» тут адносяць не гомасексуальныя дачыненні, а неадпаведныя сексуальныя паводзіны, гвалтоўныя дзеянні. Выраз паходзіць з рэлігійнай праваслаўнай літаратуры. Адзначым, што шырокае разуменне садаміі было не толькі ў нас, але, напрыклад, у Італіі. *Davidson N.* Theology, nature and the law: sexual sin and sexual crime in Italy from the fourteenth to the seventeenth century // Crime, Society and the Law in Renaissance Italy Edited by T. Dean, K.J.P. Lowe. – Cambridge University Press, 1994. – P. 76.

[25] Выказваю шчырую падзяку літоўскаму даследчыку Гедымінасу Лісмайцісу за магчымасць карыстацца гэтым дакументам. ЦДІАУК. – Ф. 25, оп. 1, спр. 9, арк. 71 адв.

[26] Pamiętniki Samuela i Bogusława Kazimierza Maskiewiczow (wiek XVII) / Oprac. A. Sajkowski. – Wrocław, 1961. – S. 137-138.

[27] НГАБ. – Ф. 1781, воп. 1, спр.1, арк. 302.

[28] Акты, издаваемые Виленскою комиссиею для разбора древних актов (далей – АВАК). – Т. 26. Акты Упитского гродского суда. – Вильна, 1899. – С. 325-326.

[29] АВАК. – Т. 36. Акты Минского гродского суда. 1582–1590 гг. – Вильна, 1912. – С. 385.

былі прысуды, цяжка вызначыць, бо прадстаўлены толькі скаргі. Шлюбам мог скончыцца толькі выпадак з Нямірам. Т. Чацкі, спасылаючыся на А. Ратундуса, адзначае, што шлюбы з гвалтаўнікамі былі вельмі рэдкім выпадкам. Адзін меў месца ў перыяд панавання Жыгімонта Старога, калі мужчына згвалтаваў дзвюх жанчын, і яны выказалі жаданне выйсці за яго замуж. Але, невядома, чым скончылася справа[30].

Варта адзначыць, што ў судовай практыцы мелі месца выпадкі вызвалення злачынцы ад пакарання дзякуючы шлюбу. Гэта сведчыць пра верагодную магчымасць шлюбу з гвалтаўніком. Калі за забойства таварыша гайдук Януш Кобрынец, які служыў у падстолія ВКЛ Мікалая Глябовіча, быў асуджаны на смерць, то выратаваннем ад пакарання стала жаданне ольіцкай мяшчанкі стаць яго жонкай (1606)[31].

Судовая практыка ведае выпадак, калі артыкул аб згвалтаванні выкарыстоўваўся жанчынай для выйсця замуж. Друзіяна Няміраўна праз умацаванага Яна Абергарта абвінаваціла віленскага мешчаніна Андрэя Капусту ў згвалтаванні (1546). Пры вывучэнні справы высветлілася, што мешчанін спакусіў дзяўчыну, калі яна начавала ў яго доме, абяцаючы ажаніцца з ёй. Аднак пасля здарэння сваё абяцанне Капуста не спяшаўся выканаць, што прымусіла шляхцянку выкарыстаць стары метад для шлюбу – абвінаваціць у згвалтаванні. У выніку суд вызваліў мешчаніна ад адказнасці, але яны павянчаліся адразу перад суддзямі[32]. У дадзеным выпадку дашлюбныя сексуальныя адносіны справакавалі абвінавачванне ў злачынстве, вынікам чаго стаў шлюб. Друзіяна праз свайго ўмацаванага магла ведаць, што па заканадаўстве наступствам такой скаргі можа быць прымусовы для Капусты шлюб.

Злачынствы аб згвалтаванні разглядаліся ў магістратах. Пры чым абвінавачванні без доказаў не прымаліся. Магілёўскі магістрат разглядаў скаргу Ескі Празаровіча і яго жонкі Огрыні на сляпога Усціна Анушковіча. Быццам бы ён згвалтаваў жанчыну ў каморы шынка, калі яе муж выправіў туды за півам. Пры разглядзе аказалася, што Усцін ужо быў праз яе зняволены бязвінна гродскім судом. За фальшаванне справы прысудзілі выплаціць Усціну страты за суды. Пачуўшы прысуд Еска стаў неадпаведна паводзіць у судзе, казаў, што не хоча далей жыць з Огрыняй. Яго адправілі ў вязніцу да таго часу, пакуль не возьмуць на парукі (1577)[33]. Па сутнасці на судзе не было прадстаўлена адпаведных доказаў. Судовыя матэрыялы не паказваюць прычыну няслушнага абвінавачвання. Магчыма, каб схаваць свае грахі перад мужам, Огрыня прадставіла Усціна як гвалтаўніка.

[30] Аўтар не прыводзіць назву твора. *Czacki T.* O litewskich i polskich prawach. – T. 2. – S. 127-128.

[31] Архив Юго-западной России. – Ч. 8. – Т. 3. – К., 1909. – С. 521-522.

[32] Скарга разглядалася ў судзе віленскага ваяводы Яна Глябовіча. Lietuvos Metrika. Kn. 234 (1546–1548): 19-oji Teismų bylų knyga / Parengė I. Valikonitė, S. Viskantaitė-Saviščevienė, L. Steponavičienė. – Vilnius, 2009. – P. 71-72.

[33] Актовая книга Могилевского магистрата // Историко-юридические материалы, извлечённые из актовых книг губернии Витебской и Могилёвской, хранящихся в центральном архиве в Витебске. Вып. 30. – Витебск, 1903. – С. 10-12.

Наступная скарга таксама паходзіць з Магілёўскага магістрата. У 1579 г. Адар'я Іваноўна абвінаваціла Івана Паўловіча ў згвалтаванні сваёй унучкі Марыі. Яна сцвярджала, што гвалту не бачыла, а толькі чула крыкі. Іншых доказаў не было прадстаўлена. Спасылаючыся на артыкул XXXVIII Вейхбільда ўмацаваны ад абвінавачваемага боку Іван Багдановіч аргументаваў, што выпадак адбыўся днём, а значыць злачынцу можна было злавіць і прывесці да ўраду. На карысць невінаватасці Паўловіча сведчылі сведкі, яго прысяга і добраахвотны прыход у суд. Мешчанін быў апраўданы[34]. У гэтым выпадку кіраваліся правам пры вынясенні прысуду. Да таго ж добрае веданне заканадаўства ўмацаваным дало магчымасць вынесці апраўданне Паўловічу.

Выпадак згвалтавання дзяўчыны Марухны Станіславаўны Кузьмой Васілевічам быў даказаны. Яна прыйшла да яго маці за дражджамі, а мешчанін скарыстаўшыся адсутнасцю людзей у хаце, згвалтаваў. Полацкі магістрацкі суд прысудзіў злачынцу да смяротнага пакарання (1640)[35].

У кнігах гарадзенскага войта Канстанціна Александровіча была зафіксавана скарга Алены Янаўны, якая першы раз была за Аляксеем Крыштаповічам, другі – за Паўлам Хілімонавічам. Разам з дачкой ад першага шлюбу Даркай абвінавачвала мешчаніна Станіслава Смяроўскага з Баранавічаў у згвалтаванні. Дарка ў яго была чаляднiцай. Смяроўскі выправіў яе ў лес за грыбамі да Чурылаўшчыны, там і адбылося злачынства, нягледзячы на супраціўленне Даркі (1668). Аднак Смяроўскі фігураваў як сведка ў справе жыдоў і А. Венты[36]. Значыць або згвалтаванне не было даказана, або пакаранне было іншым. У кнігах гарадзенскага магістрату выяўлены толькі гэты выпадак, але не значыць, што не было іншых.

З артыкулам аб згвалтаванні быў звязаны артыкул аб гвалтоўным шлюбаванні з жанчынай. За гэтае злачынства мужчыну каралі смерцю, а 1/3 яго маёмасці пераходзіла пакрыўджанаму боку, а з 2/3 – выплачваліся страты. Калі дзяўчына ўдзельнічала ў змове, то яна пазбаўлялася спадчыны і пасагу (Статут 1566 г. Р. 11. Арт. 9)[37]. У Статуце 1588 г. гэты артыкул быў пашыраны. Мужчына не караўся смерцю, калі дзяўчына давала згоду на шлюб. Аднак пры ўзяцці дзяўчынай рэчаў з дому, сваякі мелі права вяртаць маёмасць праз суд (Статут 1588 г. Р. 11. Арт. 13)[38]. Гэтая норма была ўведзена з-за даўняй традыцыі выкрадання нявесты, аб якой узгадваецца яшчэ ў «Аповесці мінулых гадоў». Шлюб праз гвалт адбываўся без згоды бацькоў, што супярэчыла кананічнаму праву[39]. Водгаласы такога шлюбу захаваліся ў беларускіх народных абрадах

---

[34] АВАК. – Т. 39. Акты Могилевского магистрата XVI в. (1578–1580). – Вильна, 1915. – С. 185-186.

[35] Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. – Т. 1. – Вильна, 1867. – С. 313-319.

[36] НГАБ. – Ф. 1800, спр. 1, арк. 168; Ф. 1761, спр. 2, арк. 420, 421, 424-426.

[37] *Лаппо И.И.* Великое княжество Литовское. – С. 521.

[38] *Малиновский И.* Учение о преступлении. – С. 59.

[39] *Макушев В.В.* Сказания иностранцев о быте и нравах славян. – СПб., 1861. – С. 138-139; *Ланге О.* О правах собственности супругов по древнерусскому праву. – СПб., 1886. – С. 24; *Неволин К.А.* Полное собрание сочинений. Т. 3. История Российских гражданских законов. – СПб.,

яшчэ ў XIX ст.[40] А часам нават здараліся выпадкі вывазу дзяўчат[41]. Звычай крадзяжу нявесты таксама меў месца ў еўрапейскіх краінах[42]. Паводле класіфікацыі крымінальных спраў па соймавай пастанове 1611 г., шлюб праз гвалт быў аднесены да віду прыватнай крымінальнай справы. У сувязі з гэтым загадвалася разглядаць гэтыя справы як іншыя крымінальныя, злачынца саджаць у вязніцу, нават калі жанчына сведчыла на яго карысць[43].

Шлюб праз гвалт заставаўся актуальнай праблемай, што прымушала прымаць адпаведныя меры. У соймавую канстытуцыю 1607 г. быў унесены пункт аб гвалтоўным вывазе непаўналетніх асобаў жаночага полу ад бацькоў ці апекуноў. Такія злачынцы падлягалі зняволенню. Справы адносіліся да кампетэнцыі мясцовых судоў[44]. На сойме 1631 г. было адзначана аб пашырэнні ў практыцы шлюбаў праз гвалт. Была прынятая пастанова пра павелічэнне грашовага спагнання за вываз жанчыны, з дадаткам, што ад пакарання рабаўнік не можа быць вызвалены, нават калі жанчына пад прысягай сведчыла, што была згодна выехаць, але яе сваякі гэтага не пацвярджалі. Такія справы разглядаліся ў Трыбунале[45]. Нунцый Ганарацы Вісконці ў лісце да кардынала дэ Торэса ад 22 сакавіка 1631 г. згадаў гэтую пастанову і адзначыў, што яна павінна зменшыць колькасць падобных выпадкаў[46]. Шлюб праз гвалт меў непасрэднае дачыненне да згвалтавання, бо жанчына апынался пад прымусам не толькі ў царкве, але і ў ложку. Гісторыя пакінула сведчанні, калі згвалтаванне з'яўлялася істотным аргументам для шлюбу. Упершыню такі выпадак у беларускай гісторыі занатаваны ў летапісах, калі князь Уладзімір забіў сям'ю Рагвалода, а яго дачку Рагнеду прымусова ўзяў у жонкі[47]. Але такі ўчынак быў уласцівы і іншым уладарам. Баляслаў I у выправе на Кіеў згвалтаваў дачку кіеўскага князя Прадславу. У падобным выпадкам жанчына ўвасабляла сабой сваю краіну. Улада над ёй азначала ўладу над краінай, якую перамаглі[48]. Гэта быў акт падпарадкавання і прыніжэння. Не па сваёй волі пайшла замуж Бірута за вялікага князя Кейстута[49].

У XVI ст. Ян Ласіцкі і Паўль Одэрборн пры апісанні шлюбнага абраду ў ВКЛ адзначалі, што пазбаўленне дзявоцкасці прымушала незгаворлівых бацькоў

1857. – С. 128-129; *Abraham W.* Zawarcie małżeństwa w pierwotnem prawie polskim. T. IX. – Lwów, 1925. – S. 67-75; *Krawiec A.* Seksualność. – S. 63.

[40] *Багдановіч А.* Пережитки древнего миросозерцания белорусов. Этнографический очерк. Гродна, 1895 / Рэпрынт. – Мінск, 1995. – С. 121.

[41] *Никольский Н.М.* Происхождение и история белорусской свадебной обрядности. – С. 52-54.

[42] *Brudage J.A.* Law, Sex, and Christian Society. – P. 128; McNamara Jo Ann, S. Wemple. The Power of Women through the Family in Medieval Europe 500–1100 // Women and Power in the Middle Ages. – Athens and London, 1998. – P. 85.

[43] Volumina legum. T. III. – Petersburg, 1859. – S. 36, 326.

[44] Volumina legum. T. II. – Petersburg, 1859. – S. 444.

[45] Volumina legum. T. III. – S. 326.

[46] [Rekaczewski E.]. Relacye nuncyuszów apostolskich i innych osób o Polsce od roku 1548 do 1690. T. 2. – Berlin; Poznań, 1864. – S. 180-183.

[47] ПСРЛ. Т. 35. – Москва, 1980. – С. 39, 80.

[48] *Krawiec A.* Seksualność. – S. 161-167.

[49] ПСРЛ. – Т. 35. – Москва, 1980. – С. 97, 181, 201; Т. 32. – М., 1968. – С. 138.

пагаджацца на шлюб[50]. Згвалтаванне дыскрэдытавала жанчыну і яе сям'ю. Выйсцем быў шлюб з гвалтаўніком[51].

У судовай практыцы сустракаліся выпадкі абвінавачвання ў гвалтоўным узяцці ў шлюб. Ядвіга Гальшанская падала скаргу ў суд Паноў Рады на Юрыя Осціка і абвінаваціла яго ў гвалтоўным выкраданні яе дачкі Ганны Літавораўны Храптовічаўны (1516). Насуперак волі Ганны, маці хацела выдаць яе замуж за падкаморыя ВКЛ Андрэя Якубавіча Давойну (?–1527) і адмовіла будучаму гаспадарскаму маршалку Юрыю Осціку (?–1549). Да шлюбу Ядвіга трымала дачку ў манастыры, адкуль Ганна з'ехала з Ю. Осцікам. У вечар ад'езду планавалася вяселле з А. Давойнам. На судзе Ю. Осцік сказаў, што жонка добраахвотна паехала з ім. Паказанні Ганны пацвердзілі яго словы і сведчылі пра прымус маці. Суд, выслухаўшы ўсе бакі, прыняў рашэнне: Ганна магла пайсці да мужа або да маці. Юрый Осцік прызнаваўся невінаватым[52].

Шляхцічу было прад'яўлена сур'ёзнае абвінавачванне, за якое маглі прысудзіць да смяротнага пакарання. Такі прысуд мог быць прыняты на пачатку XVI ст., калі яшчэ не былі выпрацаваны заканадаўчыя нормы і ў судзе карысталіся звычаёвым правам. Цікава, што дзяўчына, якая выйшла замуж супраць волі маці, не толькі не была пакарана за свой учынак, а яшчэ мела права выбару. Пазней, з прыняццем Статутаў, за самавольны шлюб шляхцянку пазбаўлялі пасагу. На той час гэты ўчынак не дыскрэдытаваў дзяўчыну ў вачах асяроддзя. Аднак тут яшчэ трэба мець на ўвазе, што Я. Гальшанская мела вельмі скандальную рэпутацыю і часта была ў судах. Яна судзілася з другім зяцем Янам Аборскім, якому сама адвезла малодшую дачку Зафею, а потым абвінаваціла яго ў яе гвалтоўным выкраданні. Але прымас Ян Ланскі пацвердзіў законнасць шлюбу[53].

Невядома, чым скончыўся судовы працэс слонімскага баярына з вёскі Радзівілавічы Мацея Войцехавіча супраць Яцка Пятровіча. Апошні скраў у яго пасынка нявесту Ядвігу, дачку слонімскага баярына Юхны Міхайлавіча (1562). Акрамя гэтага, былі спісаны ў асобны рэестр выдаткі на вяселле (піва, гарэлка і інш.), якія павінен быў кампенсаваць вінаваты бок. Бацька нявесты таксама падаў скаргу на Я. Пятровіча за выкраданне дачкі[54].

---

[50] (*Łasicki J.* De Russorom Moskovitarum et Tartarorum religiona, sacrificiis, nuptiarum, runerum ritu. – Spirae, 1582. – P. 241-245). *Ласіцкі Я.* [Шлюбныя звычаі на Беларусі ў XVI ст.] // Вяселле: Абрад / Уклад., уступ. арт. і камент. К.А. Цвіркі; Муз. дадат. З.Я. Мажэйка; Рэд. В.К. Бандарчык, А.С. Фядосік. 2-е выд. – Мінск, 2004. – С. 38-39; *Oderborn P.* De Russorum religione, ritibus nuptiarum, funerum, victu, vestitu, &c. et de Tartarorum religione ac moribus: vera et luculenta Narratio. Ad D. Davidem Chytraeum recens scripta. – [Rostock] Excudebat Stephanus Myliander, 1582. – P. Bv-B2.

[51] Падобна, што выпадак згвалтавання апісаны ў Львоўскім гродскім судзе 1637 г. меў на мэце шлюб. *Вінниченко О.* «Ґвалт поневольний». – С. 435-451.

[52] НГАБ. – Ф. 694, воп. 1, спр. 287, арк. 118-119 адв.; РИБ. Т. 20. Литовская метрика. Т. 1. – Петербург, 1903. – С. 944-948; *Jankowski Cz.* Powiat Oszmiański. Materiały do dziejów ziemi i ludzi. Cz. I. Peterburg, 1896. – S. 280-281.

[53] *Jankowski Cz.* Powiat Oszmiański. – S. 280-281.

[54] НГАБ. – Ф. 1781, воп. 1, спр.1, арк. 68-68 адв.

Вынік наступнай скаргі таксама невядомы. Мельхер Сноўскі абвінавацію ротмістра Грыгорыя Войну ў гвалтоўных дзеяннях супраць дачкі Мацея Клочкі – Раіны. 21 чэрвеня 1573 г. ротмістр, скарыстаўшыся адсутнасцю гаспадароў, вывез яе у Падароск (Ваўкавыскі павет) і ажаніўся з ёй. Пасля смерці бацькі дзяўчына знаходзілася ў апецы Сноўскага. Яна была непаўналетняй на той час, таму адказнасць за яе нёс апякун[55].

Справа аб гвалтоўным вянчанні Кацярыны Ватальтовічаўны з палкоўнікам маскоўскіх войскаў Львом Сыціным разглядалася ў судзе метонскага біскупа, віленскага суфрагана, а таксама ў Віленскім гродскім судзе. Жанчына была гвалтоўна скрадзена палкоўнікам у Вільні. Пад пагрозай смерці яе прымусілі выйсці замуж. Кацярына пражыла з мужам 12 тыдняў. Былі беспаспяховыя спробы падаць на яго скаргі ваяводзе Мышэцкаму. Але апошні быў вядомы злачынствамі супраць мясцовага насельніцтва. Пасля вызвалення Вільні ад маскоўскіх войскаў другі муж Кацярыны, Ян Лісоўскі, земянін Лідскага павета, ініцыяваў справу супраць дзеянняў палкоўніка маскоўскіх войскаў Льва Сыціна (1665)[56].

Квіт пра атрыманне пасагу Янам Рымвідам Міцкевічам і яго жонкай Альжбетай Лявонаўнай ад маці Марыяны Тызенгаўзаўны і яе другога мужа Яна Левіна, капітана ЯКМ, утрымлівае апісанне абставінаў шлюбу праз гвалт (1689). У дакуменце Ян адзначыў, што паводзіў сябе як «непрыстойны зяць». 12 мая 1688 г. ён вывез дзяўчыну гвалтоўным чынам з бацькоўскага маёнтка Серафімішкі (Упіцкі павет). За што быў абвешчаны банітам і асуджаны на смерць. Аднак нейкім чынам у яго атрымалася ўладзіць справу. Маці і айчым скасавалі скаргі на яго і далі благаславенне на шлюб[57]. Гэты выпадак даволі рэдкая ілюстрацыя выканання нормы Статута адносна шлюбу праз гвалт. Справу ініцыявалі бацькі дзяўчыны, дамагліся асуджэння на смерць зяця. Выкананне прысуду было адменена дзякуючы згодзе на шлюб.

Як паказваюць факты гвалтоўна маглі не толькі выдаць дзяўчыну замуж, але і ажаніць хлопца. У заканадаўстве такі выпадак не агаворваўся. Шляхціч Мсціслаўскага ваяводства Ян Тэадор Станкевіч падаў скаргу ў Мсціслаўскі гродскі суд аб сваіх непрыемнасцях падчас вайны Рэчы Паспалітай з Расіяй (1663). Ён быў захоплены маскоўскім войскам у сваім маёнтку Полуляхаўшчына (1655). У палоне яго прымусова ажанілі з дачкой папа Чыжа[58].

Гісторыя шлюбу Францішка Мялешкі (?–1715) і Гальшкі Колышкавай нетыповыя. Пасля смерці старэйшага брата Міхаіла Мялешкі (? – пасля 1650), які не пакінуў нашчадкаў, Францішак застаўся старэйшым у сям'і, але ён быў непаўналетнім. Сваякі з Валыні напісалі, каб Францішак прыехаў і застаўся ў іх да свайго паўналецця. Па дарозе яго перахапіў Яраш Колышка, які служыў у яго

[55] Там сама, арк. 457.

[56] Імя біскупа не згадваецца. АВАК. – Т. 20. Акты, касающиеся города Вильны. – Вильна, 1893. – С. 386-387.

[57] Дакумент быў актыкаваны ў кнігі гродскага суда Упіцкага павета 7 снежня 1689 г. AGAD. Archiwum Tyzenhauzów. Sygn. G-205.

[58] АВАК. – Т. 34. Акты, относящиеся ко времени войны за Малороссию (1654–1667). – Вильна, 1909. – С. 300-301.

бацькі і быў добра інфармаваны пра ўсе справы сям'і Мялешкаў, а таксама трымаў у заставе фальварак, куды і прывёз юнака. Там увечары яго падпаіў і ажаніў са сваёй дачкой Гальшкай. Усе правілы шляхецкага шлюбу былі парушаны. Не было змовінаў, шлюбнай дамовы, запісу вена і пасагу і інш. Ранкам Францішак даведаўся, што ён жанаты, і быў настолькі раз'юшаны, што ледзь не забіў Я. Колышку. Аднак той супакоіў яго, паабяцаўшы за дачкой пасаг 12 000 злотых. У сувязі з тым, што зяць быў непаўналетнім і па заканадаўстве не мог самастойна валодаць маёмасцю, Дзевяткавічамі і іншымі ўладаннямі стаў кіраваць Я. Колышка. За перыяд яго кіравання ўладанні Мялешкаў былі спустошаны. Ён нарабіў шкоды на 100 000 злотых, а судовыя працэсы праз яго каштавалі 70 000 злотых. Яму было вынесены смяротнае пакаранне, а яго саўдзельнікам – баніцыя[59].

Выявіць шлюб праз гвалт ці шлюб пад прымусам можна толькі пры наяўнасці судовай скаргі. У іншым выпадку знайсці такую інфармацыю даволі складана. Падобныя шлюбы пры намаганні сваякоў жанчыны скасоўваліся. Такія з'явы прымусілі прымаць на сойме дадатковыя пастановы да артыкулаў Статута 1588 г. Шлюбы пад прымусам мелі месца не толькі на тэрыторыі ВКЛ[60]. Выпадкі сустракаліся на Валыні[61]. Удава па валынскім падваяводзе Адаму Букаемскаму, Зафея са Свідна, падала скаргу на Войцеха Даманькоўскага за тое, што напаў на яе на дарозе, завёз у свой маёнтак, згвалтаваў і прымусіў выйсці замуж (1598)[62].

Ахвярай гвалту магла стаць любая жанчына, незалежна ад статусу і ўзросту. У якасці гвалтаўнікоў выступалі вайскоўцы, суседзі, знаёмыя і незнаёмыя асобы. Мелі месцы як гвалтоўныя напады, так і карыстанне склаўшайся сітуацыяй. Ініцыявалі справу сужэнцы ці сваякі пацярпелай. Заканадаўства адназначна выказвалася за смяротнае пакаранне для злачынцы.

Шлюб праз гвалт таксама прадстаўляў небяспеку для сям'і. Гэта была пагроза рэпутацыі, шлюбным стратэгіям, маёмасці. Такі шлюб парушаў як кананічнае права, так і заканадаўства. Лёс правапарушальніка залежаў ад сям'і. Ён мог быць пакараны, а мог стаць зяцем. Выпадкі гвалту супраць волі мужчыны, гэта было выключэнне, а не правіла.

У грамадстве ВКЛ не было створана спрыяльнай сітуацыі для гвалтаўнікоў ні ў заканадаўстве, ні ў грамадскай думцы. Такія паводзіны адносіліся да супрацьпраўных, а не да нормы. Згвалтаванне як від злачынства даволі старажытнае, якое не выкаранілі нават сёння. Прычына яго палягае ў першую чаргу ў мужчыне, які не кантралюе сваю хцівасць і дамагаецца жанчыны любым спосабам.

---

[59] НГАБ у Гродне. – Ф. 1663, воп. 1, спр. 874; спр. 591, арк. 3-5; *Сліж Н.* Унутрысямейныя адносіны ў сям'і Мялешкаў са Слонімскага павета ВКЛ у другой палове XVII ст. // Павятовая шляхта ВКЛ: гісторыя, геральдыка, генеалогія, культура (XVI–XVIII ст.). Матэрыялы навук. канф., Горадня, 18 лютага 2005 г. – Горадня, 2006. – С. 76-86.

[60] *Майлз Р.* Жаночая гісторыя свету. – Мінск, 2006. – С. 101-102.

[61] *Ворончук І.* Подружні зради як наслідок практики укладання шлюбів в Україні в XVI–XVII ст. (на матеріалах ранньомодерної Волині) // Соціум. – 2006. – Вип. 6. – С. 165-167.

[62] Архив ЮЗР. – Ч. 8. – Т. 3. – К., 1909. – С. 476-478.

Патэнцыйна жанчына фізічна слабейшая за мужчыну і не можа даць адпаведны супраціў. Канечне, гэта ўлічвалася правапарушальнікамі.

Прасачыць тэндэнцыі ў згвалтаваннях і шлюбах праз гвалт вельмі складана па прычыне адсутнасці адпаведнай базы крыніц. Яе фрагментарнасць робіць недасягальнымі для даследавання псіхалогію злачынцы і ахвяры, далейшы лёс жанчыны, механізмы рэалізацыі заканадаўства, тэрытарыяльныя асаблівасці выпадкаў і іншыя аспекты.

## РЕЗЮМЕ

*Наталя Сліж*

### ЗГВАЛТУВАННЯ У ВЕЛИКОМУ КНЯЗІВСТВІ ЛИТОВСЬКОМУ В XVI–XVII ст.: ЗАКОНОДАВСТВО ТА СУДОВА ПРАКТИКА

Тема згвалтувань у Великому Князівстві Литовському в XVI–XVII ст. практично залишилася поза увагою дослідників. За жанром вона є доволі специфічною і, як правило, досліджується в контексті гендерних відносин, історії сексу, кримінальних злочинів.

У даній статті розглядається згвалтування в законодавстві і судовій практиці. Крім того, звертається увага на шлюб з використанням сили, в якому було психологічне і фізичне насилля.

У суспільстві ВКЛ не було створено сприятливої ситуації для гвалтівників ні в законодавстві, ні в громадській думці. Така поведінка трактувалася як протиправна, а не норма. Прослідкувати тенденції в згвалтуваннях і шлюбах, створених через насилля, дуже складно за браком відповідних джерел. Її фрагментарність робить недосяжними для дослідження психологію злочинця і жертви, подальшу долю жінки, механізми реалізації законодавства, територіальні особливості випадків та інші аспекти.

***Ключові слова:*** згвалтування, шлюб через насильство, законодавство ВКЛ, судова практика

*Наталья Слиж*

### ИЗНАСИЛОВАНИЯ В ВЕЛИКОМ КНЯЖЕСТВЕ ЛИТОВСКОМ В XVI–XVII вв.: ЗАКОНОДАТЕЛЬСТВО И ПРАКТИКА

Тема изнасилования в Великом княжесве Литовском в XVI–XVII вв. практически осталась вне внимания исследователей. Она достаточно специфическая для изучения и, как правило, ее исследуют в контексте гендерных отношений, истории секса, преступлений.

В данной статье рассматривается изнасилование в законодательстве и судебной практике. Кроме того, внимание обращено на брак с использованием силы, в котором было психологическое и физическое насилие.

В обществе ВКЛ не было создано благотворной ситуации для насильников ни в законодательстве, ни в общественном мнении. Такое поведение трактовалось как противоправное, а не норма. Проследить тенденции в изнасилованиях и браках по принуждению очень сложно по причине отсутствия соответствующей базы источников. Её фрагментарность делает недосягаемым для исследования психологию преступника и жертвы, дальнейшую судьбу женщины, механизмы реализации закона, территориальные особенности прецедентов и другие аспекты.

***Ключевые слова:*** изнасилование, брак с использованием силы, законодательство ВКЛ, судебная практика.

*Natalia Slizh*

## RAPE IN THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA IN THE 16–17 cent.: LAW AND JUDICIAL PRACTICE

Rape in the Grand Duchy o Lithuania in the sixteenth – seventeenth centuries has not been studied practically. The topic is very specific for research. Usually it is analysed in the context of gender relations, history of sex or crimes.

This article presents rape in law and judicial practice. Besides this the attentions is paid to marriage under compulsion because it had physical and psychological violence.

The society of the GDL did not create auspicious conditions for violators in law and public opinion. Such behavior was treated as unlawful but not as a norm.

It is difficult to trace the tendencies of rape and marriage under compulsion because of lack of corresponding sources. Fragmentariness of documents does not give opportunity to study psychology of a violator and a victim, further fate of a woman, realization of the law, specific of crimes according to the territory and other aspects.

***Keywords:*** rape, marriage under compulsion, law of the GDL, judicial practice.